ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Настаўніцкая газета
№ 113 от 10.10.2017

# Працоўная моладзь гімназіі

**Як гімназісту арганізаваць свой вольны час і прынесці карысць людзям, а яшчэ ўбачыць вынік сваёй працы і зарабіць грошы на кішэнныя расходы? Усё гэта можна ажыццявіць у працоўнай брыгадзе, якая функцыянуе па лініі другаснай занятасці. Другасная занятасць моладзі становіцца школай адказнай працы з ранняга ўзросту.**

Упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Полацкага раённага выканаўчага камітэта з мэтай прыцягнення моладзі да грамадска карыснай працы ў свабодны ад вучобы час сістэматычна арганізоўвае часовую працоўную занятасць.

Такая магчымасць у чарговы раз дадзена навучэнцам 9—11 класаў полацкай дзяржаўнай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны з 2 кастрычніка 2017 года.

Кіраўніком працоўнай брыгады з'яўляецца Галіна Віктараўна Чэрнікава, намеснік дырэктара па гаспадарчай рабоце. Галіна Віктараўна адзначае, што ў другаснай занятасці важна тое, што дзіця працуе афіцыйна: на такога работніка заводзіцца працоўная кніжка, з ім заключаецца працоўны дагавор і праводзіцца інструктаж па ахове працы. "Тыя, каму споўнілася 14 гадоў, а ў групе практычна ўсе такія, працуюць строга адведзены заканадаўствам час — 2 гадзіны 18 мінут на дзень. Пасля 16 гадоў непаўналетнія маюць права працаваць па ўласнай заяве 3 гадзіны 30 мінут на дзень", — удакладняе Г.В.Чэрнікава.

У рамках другаснай занятасці распрацаваны праект "Добраўпарадкаванне тэрыторыі гімназіі". Дваццаць дзяцей будуць рыхтаваць месцы для пасадкі саджанцаў каштана і спірэі, займацца рамонтам і абнаўленнем школьнай мэблі, а таксама фарбаваннем спартыўнага абсталявання. Дзеці аб'яднаны ў групы, кожная з якіх выконвае пэўную частку работы, накіраваную на дасягненне канчатковай мэты — стварэнне добрых умоў знаходжання навучэнцаў у двары гімназіі праз добраўпарадкаванне тэрыторыі. Ад кожнага з іх залежыць якасць і тэрміны выканання работы, таму такая форма занятасці навучэнцаў выхоўвае ў іх адказнасць, працавітасць, арганізаванасць, стараннасць.

У працоўнай брыгадзе ёсць навучэнцы, якія ўжо не першы год працуюць па лініі другаснай занятасці. Карына Магіленка, навучэнка 10 "Б" класа, падзялілася ўражаннямі: "Год назад я ўжо хадзіла на другасную занятасць у нашай гімназіі. Мне гэта спадабалася: мы працавалі ў невялікім калектыве, займаліся пасадкай кветак, прапалвалі ўжо існуючыя клумбы. Я лічу, што другасная занятасць — гэта добры спосаб заробку для школьнікаў".

Падлеткам вельмі важна ўсведамляць запатрабаванасць у грамадстве і бачыць вынік сваёй працы на карысць гімназіі, роднага горада. У іх з'яўляецца імкненне зрабіць навакольны свет дабрэйшым, святлейшым і больш камфортным.